# 80-ГОДДЗЕ ПАЧАТКУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: ДАКУМЕНТАЛЬНЫ НАРАТЫЎ І ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ПАДЫХОДЫ

**Т. С. Сюзюмава**

## КНІГІ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ Ў ЛЕТАПІСЕ ЦЭНТРА БЕЛРАУСКАЙ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ

Цэнтр беларускай мовы і культуры (ЦБел) – першы з 11-моўных цэнтраў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, які распачаў сваю працу 11 мая 2001года.

Асноўны накірунак яго працы – гэта бібліятэчнае абслугоўванне чытачоў, якімі з'яўляюцца студэнты, выкладчыкі, магістранты, аспіранты і супрацоўнікі ўніверсітэта.

Фонд Цэнтра ўтрымлівае больш як 4000 экзэмпляраў, фарміруецца ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі, навучальнымі планамі і тэматыкай навуковых даследаванняў кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму і кафедры беларускай мовы і літаратуры. Згодна з гэтым, літаратура ў Цэнтры падабрана па наступных тэмах:

- беларуская гісторыя;
- беларуская мова;
- беларуская літаратура і літаратуразнаўства;
- культура і навука Беларусі;
- палітыка і эканоміка Беларусі;
- мастацтва Беларусі;
- рэлігія Беларусі.

Пры камплектаванні фонду ўлічваецца моўны аспект: літаратура на розныя тэмы прадстаўлена пераважна на беларускай мове, а таксама на замежных мовах з мэтай распаўсюджвання ведаў пра гісторыю, культуру, мову, літаратуру Беларусі ў свеце.

Збіраюцца пераклады твораў беларускіх пісьменнікаў на замежныя мовы, а таксама пераклады класікаў сусветнай літараруты на беларускую мову.

Расстаноўка кніжнага фонду сістэматычна-тэматычная, кнігі расстаўлены па сістэме ББК (бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя) з выдзяленнем тэматычных паліц, з выкарыстаннем каляровых метак. Тэматычныя падборкі выдзяляюцца з фонду ў залежнасці ад запытаў чытачоў, гэта:

- славутыя землякі;
- гарады Беларусі;
- Францыск Скарына;
- Вялікая Айчынная вайна;
- працы П. В. Васючэнкі і інш.

У ЦБел вядуцца традыцыйныя карткавыя каталогі і картатэкі і электронныя базы дадзеных:

- электронны каталог кніг;
- аналітычная база дадзеных "Беларусістыка".

Акрамя таго, супрацоўнікі Цэнтра ўдзельнічаюць у міжуніверсітэцкім праекце “БелАр”, у рамках якога бібліятэкі ВНУ Беларусі абменьваюцца бібліяграфічнай інфармацыяй. Праект створаны па ініцыятыве бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта сумесна з іншымі ўніверсітэцкімі бібліятэкамі Беларусі ў 2002 годзе.

Сёння ў праекце па стварэнні зводнай базы дадзеных аналітычных апісанняў артыкулаў з беларускіх навуковых і літаратурна-мастацкіх часопісаў удзельнічаюць 14 бібліятэк. Бібліятэка МДЛУ апрацоўвае для дадзенага праекта 5 часопісаў, 2 з якіх – у Цэнтры.

Супрацоўнікі Цэнтра займаюцца папаўненнем рэпазіторыя МДЛУ, у якім прадстаўлены вучэбныя і навуковыя публікацыі, матэрыялы канферэнцый, аўтарэфераты дысертацый, а таксама артыкулы з перыядычных выданняў выкладчыкаў і аспірантаў, студэнтаў і магістрантаў універсітэта.

Яшчэ адзін накірунак працы – гэта падборка і апрацоўка матэрыялаў для афіцыйнай старонкі бібліятэкі МДЛУ ў сацыяльных сетках, дзе публікуецца інфармацыя аб паслугах і рэсурсах бібліятэкі, аб новых паступленнях, кніжных выставах, акцыях і іншыя звесткі, якія цікавяць нашых чытачоў.

Вялікая ўвага ў Цэнтры надаецца бібліяграфічнаму абслугоўванню чытачоў. Гэта падрыхтоўка бібліяграфічных даведак, дапамога ў падборы літаратуры і складанні бібліяграфічных спісаў пры напісанні курсавых, дыпломных і кандыдацкіх прац, а таксама пры выкананні розных заданняў у працэсе вучэбнай дзейнасці. Напрыклад, для дапамогі студэнтам пры напісанні эсэ па гісторыі Беларусі на аснове дакументальных крыніц у Цэнтры складзены і ўвесь час папаўняецца бібліяграфічны паказальнік дакументальных крыніц.

Значная роля належыць выставам, праца над якімі вядзецца ў Цэнтры і мае актыўны водгук ад нашых наведвальнікаў. Галоўнымі крытэрыямі адбору экспанатаў з’яўляюцца інфарматыўнасць і рэпрэзентатыўнасць. Выпрацоўваецца навуковая канцэпцыя выставы, вызначаюцца тэма, ідэя, праблема, якія раскрываюцца з дапамогай выставы, а таксама выбіраюцца спосабы рэалізацыі задуманага. Абавязкова праводзіцца аналіз літаратурных і дакументальных крыніц па тэме выставы, разглядаецца магчымасць яе ўключэння ў адукацыйны працэс. Вось прыклады некаторых выстаў, якія адбыліся ў нашым Цэнтры:

- цыкл выстаў, прысвечаных памяці ахвяр Халакосту;
- цыкл выстаў, прысвечаных Святу Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне;
- літаратурныя выставы (напр.: “Да 90-годдзя Уладзіміра Караткевіча”);
- выставы на агульныя тэмы (напр. “Беларусы смяюцца: гумар у беларускай літаратуры і фальклоры”, “Кніжны нефармат : прысвечаная Сусветнаму дню кнігі і аўтарскага права”) і многа іншых.

Трэба адзначыць, што з першага ж дня працы ў Цэнтры вядзецца летапіс, у якім фіксуюцца ўсе падзеі, што адбываюцца ў ЦБел. Гэта літаратурныя сустрэчы, канферэнцыі, прэзентацыі і іншыя мерапрыемствы. Вялікая падзяка за дапамогу П. В. Васючэнку, якога на жаль ужо няма з намі, С. Я. Новікаву і М. М. Воінавай-Страсе – нязменным арганізатарам дадзеных мерапрыемстваў.

Свае вершы ў Цэнтры чыталі такія беларускія паэты, як Генадзь Бураўкін, Навум Гальпяровіч, Эдуард Акулін, Уладзімір Мазго, Раіса Баравікова, Алесь Бадак, Андрэй Хадановіч і многія іншыя.

Цікавая паралель праводзіцца ў сувязі з выступленнямі ў Цэнтры дзеячоў навукі і культуры. Да прыкладу можна ўзяць маладых літаратараў, удзельнікаў літаратурнага таварыства "Бум-Бам-Літ" (кан. 90-х – пач. 2000-х), а канкрэтней маладога паэта Віктара Жыбуля, які выступаў у Цэнтры ў 2002 г. і пакінуў у летапісе такі верш: "Запусьцілі мы ракету. Быў Сусьвет – няма Сусьвету". А цяпер гэта вядомы паэт, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, які займаецца даследаваннем гісторыі беларускай літаратуры, пошукам імёнаў забытых белрускіх пісьменнікаў гадоў Вялікай Айчыннай вайны.

Праходзілі ў Цэнтры і монаспектаклі Галіны Дзягілевай – актрысы тэатра аднаго акцёра "Зьніч".

Крыху падрабязней пра некаторыя прэзентацыі, якія адбыліся ў ЦБел за 20 гадоў яго працы.

- Прэзентацыі кніг нямецкага гісторыка і пісьменніка Паўля Коля "Найлепшыя прывітанні з Мінска" пра забойства Вільгельма Кубэ ў часы Вялікай Айчыннай вайны (спачатку нямецкамоўнай версіі ў 2002 г., а затым беларускамоўнага перакладу, зробленага выкладчыкамі і студэнтамі МДЛУ ў 2003г.).
- Прэзентацыя кнігі нямецкага гісторыка Бернгарда К'яры "Штодзённасць за лініяй фронту".
- Прэзентацыя зборніка дакументаў пад рэдакцыяй Раісы Чарнаглазавай "Ваеннапалонныя" і зборніка дакументаў "Трасцянец", складальнікамі якога з'яўляюцца Раіса Чарнаглазава і Сяргей Жумар.
- Грамадскае абмеркаванне цыкла работ "Беларускія астарбайтары", вылучаных для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2002 г.
- Прэзентацыя кнігі Сяргея Новікава "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны".
- Літаратурная сустрэча з Габрыэлем Хаймам – швейцарскім публіцыстам, пісьменнікам, аўтарам кнігі "Я не хачу чарнічнага пірага, я толькі хачу пакінуць гэта месца. Любоў матулі ў пісьмах" (па пісьмах сваёй бабулі, якая ў 1942 г. была вывезена з Берліна ў Трасцянец, дзе і загінула ва ўрочышчы Благаўшчына).
- Прэзентацыя кнігі Пятра Васючэнкі "Дванаццаць подзвігаў Геракла".
- Прэзентацыя першай у Беларусі прафесійнай праграмы праверкі арфаграфіі беларускай мовы.

Частымі гасцямі Цэнтра з'яўляліся прадстаўнікі рэдакцый розных беларускіх часопісаў і выдавецтваў:

- Беларуская энцыклапедыя ім. П. Броўкі;
- Рэдакцыя часопіса "Маладосць"( у часопісе існуе рубрыка "Пераклады студэнтаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта");

- Рэдакцыя часопіса “Бярозка”;
- Рэдакцыя “Беларускага гістарычнага часопіса”;
- Рэдакцыя часопіса “Полымя”;
- Кіраўнікі выдавецтва “Мастацкая літаратура”.

І яшчэ пра многія іншыя цікавыя мерапрыемствы можна даведацца з нашага летапісу.

Пачынаючы з 2008 г. у Цэнтры штогод праходзіць навуковая канферэнцыя “Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць”, а ў 2016, 2018, 2020 гадах – міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларуская мова, літаратура і свет: праблемы рэпрэзентацыі”. Для гэтых мерапрыемстваў супрацоўнікамі Цэнтра рыхтуюцца выставы, падбіраюцца неабходныя матэрыялы і дакументы.

Многія кнігі з фонду Цэнтра беларускай мовы і культуры з’яўляюцца дарункамі яго наведвальнікаў і гасцей. У нашых фондах захоўваюцца кнігі з аўтографамі Рыгора Барадуліна і Уладзіміра Арлова, Навума Гальпяровіча і Уладзіміра Сіўчыкава, Лявона Баршчэўскага і Пятра Васючэнкі, Генадзя Бураўкіна і Зміцера Вішнёва, Паўля Коля і Сяргея Новікава, Юліі Кантар і Анатоля Шаркова, Бернгарда К’яры і Крысціяна Ганцара і многіх, многіх іншых. Мы вельмі ўдзячныя гэтым выбітным дзеячам навукі і культуры за значную дапамогу ў фарміраванні фонду Цэнтра беларускай мовы і культуры.